


Надвор'е

# Цёплыя грыбныя дажджы

## А потым зноў за 30

**Ліпень у нашай краіне амаль заўсёды быў самым гарачым месяцам. У гэтым сезоне, падобна, ён стане і самым дажджлівым. Ва ўсякім выпадку, у найбліжэйшыя дні аранжавы ўзровень небяспекі аб'яўлены ў нас менавіта з-за моцных лівеняў, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У пятніцу ўмовы надвор'я будуць вызначаць атмасферныя франты. Чакаецца воблачнасць з праясненнямі. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы, ноччу па ўсходзе месцамі моцныя лівені. Ноччу па ўсходзе, днём месцамі чакаюцца навальніцы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Вецер заходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра мінімальная ноччу будзе ад 11 да 17 градусаў цяпла, а максімальная днём складзе 19—25 градусаў. Атмасферны ціск будзе расці.

У суботу надвор'е вызначыць воблачнасць павышанага атмасфернага ціску. Пераменная воблачнасць, пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Вецер паўднёва-заходні ўмераны, удзень месцамі парывісты. Тэмпературны фон будзе максімальна кантрасным: калі ўначы будзе адносна холадна — ад 7 да 13 цяпла, то максімальная тэмпература днём дасягне 22—29 градусаў вышэй за нуль.

Ліпень зноў возьме надвор'е ў свае «гарачыя рукі» ў нядзелю. У гэты дзень у асноўным адаб'ецца ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску і цёплых паветраных мас, якія распаўсюдзяцца з паўднёвага захаду Еўропы. Аднак днём у паўночна-заходніх і заходніх раёнах надвор'е будзе вызначаць франтальны раздзел. Чакаецца пераменная воблачнасць. Пераважна без ападкаў, толькі днём у паўночна-заходніх і заходніх раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Вецер паўднёвай чвэрці парывісты, днём месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы 12—19 градусаў, а максімальная днём — 25—32 цяпла.

Згодна з папярэднім прагнозам, у панядзелак атмасферны фронт працягне павольна перамяшчацца праз нашу краіну, і дажджы ўжо распаўсюдзяцца ў большасці раёнаў. Пры актыўным развіцці атмасферных працэсаў месцамі яны будуць дасягаць крытэрыяў моцных, суправаджацца навальніцамі і моцным парывістым ветрам. У далейшым з ростам атмасфернага ціску інтэнсіўнасць дажджоў і плошча іх распаўсюджвання стануць меншымі.

У асобных раёнах узмацненне ветру парывамі 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 13 да плюс 20 градусаў, а ўдзень — ад плюс 20 градусаў на паўночным захадзе да плюс 32 градусаў на паўднёвым усходзе краіны.

У аўторак месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. У начны і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах слабы туман. Уначы чакаецца плюс 11—18 градусаў, а ўдзень — плюс 23—29 градусаў.

У сераду надвор'е будзе пераважна без ападкаў. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах згусціцца слабы туман. Уначы сіноптыкі абяцаюць плюс 11—18 градусаў, а ўдзень ад плюс 25 градусаў да 32 спёкі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.46 | 21.42 | 16.56 |
| Віцебск — | 4.27 | 21.40 | 17.13 |
| Магілёў — | 4.36 | 21.32 | 16.56 |
| Гомель — | 4.42 | 21.20 | 16.38 |
| Гродна — | 5.03 | 21.56 | 16.53 |
| Брэст — | 5.13 | 21.47 | 16.34 |

### Месяц

*Апошняя квадра 29 чэрвеня. Месяц у сузор'і Рака.*

### Імяніны

*Пр. Ульяны, Генадзя, Ясея. К. Зоі, Караліны, Марыі, Антона, Апанаса, Міхаіла, Якуба.*



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

## ЗАЎТРА




## 5 ЛІПЕНЯ — Даты — Падзеі — Людзі

У краіне

**1938** год — дата заснавання Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі. Тут былі змешчаны дакументы агульнабеларускага значэння з былых архіваў судоў Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай і беларускіх зямель Расійскай імперыі, як і з былых архіваў магістратаў і ратуш беларускіх гарадоў, прыватных асоб, Віленскага архіва старадаўніх актаў і Віцебскага архіва старадаўніх актавых кніг. На пачатак 1941 года архіў змяшчаў 1560 фондаў (звыш 382 тысяч спраў). Падчас Вялікай Айчыннай вайны большую частку дакументаў разрабавалі і вывезлі ў Германію і Рыгу (Латвія). Вярнуць удалося 38 054 справы (10 %) з 700 адзінак захавання на той час.

**1944** год — пачалася Беластоцкая аперацыя савецкіх войск, у выніку якой вызвалены паўночна-заходнія раёны Беларусі, фарсіраваны рэкі Свіслач і Нёман; войскі Чырвонай Арміі выйшлі на подступы да мяжы з Усходняй Прусіяй.

**1969** год — урачыстае адкрыццё мемарыяльнага комплексу «Хатынь». У памяць аб беларускіх вёсках, знішчаных нацыстамі ў гады апошняй вайны, у студзені 1966 года было прынятае рашэнне аб стварэнні ў Лагойскім раёне мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Яшчэ ў сакавіку 1967-га быў аб'яўлены конкурс на стварэнне праекта мемарыяла. У конкурсе перамог калектыў архітэктараў: ЮрыйГрадаў, Валянцін Занковіч, Леанід Левін, скульптар народны мастак БССР Сяргей Селіханаў (усе чацвёра атрымалі Ленінскую прэмію). У гэты ж дзень адбылося ўрачыстае адкрыццё і «Кургана Славы» — помніка ў гонар подзвігу воінаў 1-га, 2-га, 3-га Беларускіх і 1-га Прыбалтыйскага франтоў у Беларускай аперацыі 1944 года. Размешчаны ў Смалявіцкім раёне Мінскай вобласці.




У свеце

**1687** год — першая публікацыя «Матэматычных пачаткаў натуральнай філасофіі» Ісака Ньютана. Гэта фундаментальная праца вучонага, у якой ён сфармуляваў закон сусветнага прыцягнення і тры законы руху, якія сталі асновай класічнай механікі. Яны названыя яго імем.



**1841** год — англійскі прадпрымальнік Томас Кук адкрыў першае ў свеце турыстычнае агенцтва. Яно паспяхова працавала многія гады, пакуль не пацярпела крах у верасні 2019 года.

**1943** год — Вялікая Айчынная вайна: пачалася Курская бітва.

**1946** год — на паказе мод у Парыжы французскі мадэльер Луі Рэар упершыню прадставіў публіцы купальнік-бікіні. У гэтым уборы на подыум выйшла манекеншчыца Мішэлін Бернардзіні.

Так гаварыў...

**ЯНКА СІПАКОЎ:**

*«Можа, таму і памірае ад настальгіі (самай чорнай і самай светлай хваробы) чалавек, які пры жывой радзіме топча чужыя травы, лашчыць чужыя кветкі, чуе чужую мову ад сваіх дзяцей».*

## УСМІХНЕМСЯ

У паліцыі:

— Дапамажыце, у мяне ўкралі машыну.

— Паглядзіце фатаграфіі выкрадзеных машын, можа, знойдзеце сваю.

— А што, можна выбраць?

**Пры прыёме на работу:**

**— Добры дзень.**

**— Добры дзень, як ваша імя?**

**— Дзіма.**

**— А поўнае імя, імя па бацьку?**

**— Ведаеце, мяркуючы па маёй ранейшай зарплаце, я проста Дзімка.**

— Чай? Кава?

— А мацней?

— Ёсць архэі.



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11.900. Індэкс 63850. Зак. № 1631.

Нумар падпісаны ў 19.30 4 ліпеня 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12